# Правілы Чэмпіянату Беларусі па спартыўнай арніталогіі BirdRace-2025

**NEW** 1. Арганізатар Чэмпіяната – Клуб200

У спаборніцтвах 6 верасня 2025 года удзельнічаюць каманды з 3 ці 4 чалавек. У камандзе не можа быць больш аднаго чальца, маладзейшага за 18 гадоў. Кожная каманда да 12.00 напярэдадні спаборніцтваў паведамляе ў аргкамітэт назву каманды, яе склад, колькасць і дакладны ўзрост удзельнікаў, маладзейшых за 18 гадоў, месца старту і нумар тэлефона для сувязі з камандай. Змены ў складзе каманды або новае месца старту паведамляюцца ў аргкамітэт да пачатку спаборніцтваў. Склад каманды не можа мяняцца пасля пачатку спаборніцтваў.

2. Разам з чальцамі каманды падчас спаборніцтваў могуць знаходзіцца іншыя людзі: кіроўца, журналіст(ы), назіральнік(і). Аднак ніхто, акрамя чальцоў каманды, не можа браць удзел у пошуку і/або вызначэнні птушак.

3. Спаборніцтвы адбываюцца з 6.00 да 18.00 на працягу 12 гадзін.

4. **NEW** Фініш камандаў не пазней 19.00 у горадзе Тураў, вул.Савецкая, 2.

5. Падчас спаборніцтваў можна выкарыстоўваць любыя траспартныя сродкі.

6. Усе чальцы каманды падчас перамяшчэнняў павінны знаходзіцца ў адным транспартным сродку. Калі гэта немагчыма – напрыклад, для каманды на роварах, чальцы каманды павінны знаходзіцца на адлегласці, якая дазваляе галасавы кантакт паміж усімі чальцамі каманды. Падчас спаборніцтваў чальцы каманды павінны знаходзіцца на адлегласці, якая дазваляе галасавы кантакт паміж усімі чальцамі каманды.

7. Аб рэгістрацыі дваццатага віду і кожнага наступнага дзясятага каманды па мабільным тэлефоне пішуць SMS на пазначаны нумар: назва каманды (можна скарочанная), нумар віду і яго назва.

8. **NEW** Перамагае каманда, якая з 6.00 да 18.00 набярэ падчас спаборніцтваў найбольшую колькасць балаў. Улічваюцца толькі жывыя дзікія птушкі ў прыродных умовах у зоне правядзення чэмпіянату. Рэйтынг відаў па прызначэнню балаў наступны: (ад 1 да 4 балаў у залежнасці ад таго, колькі каманд бачылі той ці іншы від. Напрыклад: 1 бал – від быў адзначаны 75-100% камандаў, 2 бала – 26-74% камандаў, 3 бала – ад двух да 25% камандаў, 4 бала – толькі адной камандай).

9. Падчас спаборніцтваў кожная каманда вядзе спіс зарэгістраваных відаў птушак у спецыяльнай форме. Улічваюцца толькі тыя віды, якіх ўбачылі або пачулі ўсе чальцы каманды. Від, вызначаны па голасе, пазначаецца ў спісе скрыпічным ключом. Спіс птушак павінен весціся ў сістэматычным або храналагічным парадку на беларускай, рускай або лацінскай мове, з пазнакай вадаёму, населенага пункту або ўрочышча, дзе зарэгістраваны кожны від і колькасць асобін, адзначаных у момант, калі від сустрэты ўпершыню.

10. Забараняецца спецыяльна палохаць птушак ці рабіць іншыя дзеянні, каб ускладніць або зрабіць немагчымым назіранне птушак іншай камандзе.

11. Усе чальцы каманды павінны быць гатовымі даць тлумачэнні членам журы па завяршэнні спаборніцтваў пра абставіны  назірання і вызначэння відаў са спісу каманды, а таксама (калі спатрэбіцца) па зноў усталяваных спрэчных момантах.

12.Нельга выкарыстоўваць запісы галасоў птушак, сеткі або любыя іншыя прыстасаванні, акрамя бінокляў, труб, відэа- і фотакамер, транспарту і вызначальнікаў.

**13.** **NEW** Да 18.00 усе каманды павінны паведаміць у Тэлеграм фінішную колькасць зарэгістраваных відаў. Да 18.45 журы (на адрас **a.vintchevski@gmail.com)** трэба перадаць поўныя спісы відаў у выглядзе сфатаграфаванай запоўненай формы (не чыставік), а таксама даслаць запоўнены спампаваны файл з табліцай і адзначанымі відамі (якую можна запоўніць на тэлефоне).

14. Кожная каманда па заканчэнні спаборніцтваў высылае ў аргкамітэт фота каманды з оптыкай, з якой яна выступала (трубы, біноклі, фотакамеры).

15. **NEW** Пасля правядзення чэмпіянату журы вызначае каманду-пераможцу і месцы іншых каманд, пра што аргкамітэт паведамляе ўсім камандам падчас святочнай вячэры. У выпадку аднолькавай колькасці набраных балаў вышэйшае месца займае каманда, якая набярэ больш відаў. Калі ў камандаў роўная колькасць і відаў і балаў, то вышэйшае месца займае каманда, ў якой больш вілаў, якія зарэгістравала на чэмпіянаце толькі яна.

16. Спрэчныя сітуацыі вырашае журы. Журы можа звяртацца да чальцоў камандаў па ўдакладненні. Аргкамітэт/журы можа на час спаборніцтваў даслаць назіральніка ў любую з каманд. Любая каманда-удзельнік спаборніцтваў падае апеляцыю ў электронным выглядзе журы да абвяшчэння вынікаў чэмпіянату.

17. Апеляцыяй з’яўляецца аргументаваная заява з апісаннем магчымых фактаў парушэнняў правілаў альбо іншых абставінаў, якія могуць уплываць на рэзультат канкурэнтаў. Апеляцыя павінна быць узгодненая ўсімі ўдзельнікамі каманды.

18. Арганізатары чэмпіянату адказваюць за аператыўную арганізацыю работы журы па разглядзе апеляцый і своечасовае інфармаванне ўдзельнікаў чэмпіянату аб прынятых журы рашэннях. Пры разглядзе апеляцыі журы мае права запытаць інфармацыю ў любога ўдзельніка чэмпіянату, а таксама прыцягнуць незалежных экспертаў для абмеркавання спрэчных пытанняў і вынясення рашэння.

19. Адмова або несвоечасовая падача інфармацыі на запыт арганізатараў чэмпіянату ці журы, а таксама выяўленне парушэнняў правілаў чэмпіянату можа быць падставай для штрафных балаў.

20. Канчатковае рашэнне журы абскарджанню не падлягае.